# Вайна імперый



**Ігар Аляксандравіч ПУШКІН, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта харчавання.**

Лёс нашага Магілёва вельмі падобны на лёс роднай Беларусі. Яна, дзякуючы свайму геапалітычнаму становішчу, адыгрывала значную ролю ў жыцці ўсходніх славян. Зведала веліч, росквіт культуры і мастацтва, а таксама трагічныя старонкі. Бо ніводная вайна не мінула наш край.

Пакутаваў ад шматлікіх войнаў і Магілёў. Былі яны абарончыя, вызваленчыя, але былі і іншыя. Да іх адносіцца і Паўночная, якую можна назваць вайной за нараджэнне і гібель імперый.

Гэтая вайна шмат у чым вырашала будучае развіццё Еўропы і свету, пазней немагчымае без Расіі. Узнікла новая імперыя. Я б сказаў, што сапраўдны пачатак яе стварэння знаходзіцца пад беларускім мястэчкам — Лясная! У той бітве (28.09. (9.10) 1708г.) акрыяў Пётр І, будучы імператар і герой нашчадкаў «новай дзяржавы». Пераможца ў шматлікіх бітвах, герой Галоўчынскай бітвы (3.07.1708 г.), шведскі імператар Карл XII не атрымаў чаканай дапамогі і прайграў вайну, будучыню.

На фоне такіх лёсавызначальных падзей, учынкаў, вартых гераічных трагедый і велічных твораў геніяльных творцаў, зусім непрыкметна выглядаюць магілёўцы з іх «не нашай вайной», але рэальнай трагедыяй.

Што зведалі тагачасныя жыхары нашага горада? Пабory, рабаўніцтва, здзекі, прымус, неабходнасць карміць уладароў, невядома чые войскі, плаціць падаткі, будаваць пераправы і г.д. А замест удзячнасці адзін імператар загадаў абабраць цэрквы і храмы Магілёва, каб здабыць золата і срэбра на аплату сваім жаўнерам, а другі загадаў спаліць горад.

Падзеі тых часоў завяршылі залаты перыяд Магілёва — горада вольных і таленавітых майстроў і гандляроў. Матэрыяльныя страты дапоўніліся змяненнямі ў накірунках гандлёвых шляхоў. Не хутка аднавіўся горад. Адбыліся змены не толькі ў эканамічным, але і сацыяльным плане, нацыянальным складзе жыхароў.

Паўночная вайна яскрава пацвердзіла, што ва ўсялякай вайне заўжды найбольш пакутуюць мірныя людзі. Аднак яны Богам абраныя! Таму, як птушка фенікс, адрадзіўся Магілёў, і сёння яго жыхары славяць наш край і Радзіму.